www.nv-online.info

№ 46 (3991)

16 чэрвеня 2015 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На простор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

«Народная Воля»
в Twitter www.twitter.com/narodnaya_volya
в Facebook www.facebook.com/nv.online.info
в Vkontakte www.vk.com/nvonlineinfo

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА



Борис ЖЕЛИБА,
профессор, доктор экономических наук

«Зайчик» разгоняется?

Относительно короткий период устойчивости валютных курсов белорусского рубля, с чем связывали надежду на финансовую стабилизацию всей экономики Беларуси, закончился. Наш «зайчик» вновь вернулся в привычный девальвационный тренд. Так, на последних биржевых торгах доллар уверенно преодолел психологическую отметку в 15.000 белорусских рублей и вплотную приблизился к 15.500, а евро – к 17.000.

Дело в том, что некоторое укрепление белорусского рубля ранее было связано с кратковременными факторами. Некоторым образом подравнялся торговый баланс. Если по товарам он всегда имел отрицательное сальдо (за январь–апрель – минус 934,7 млн долларов), то оно перекрывалось положительным сальдо по услугам. Но активный торговый баланс стал таковым не столько за счет экспорта услуг, сколько за счет снижения импорта. Задавленные правительственной политикой импортозамещения и ухудшением своего финансового состояния импортеры снизили спрос на валюту на бирже. Население из-за падения реальных зарплат несколько месяцев выступало чистым продавцом валюты. Попридерживал рост рублевой массы Нацбанк. Но, как показала реальность, кризисная экономика не в состоянии долго на стабильном уровне поддерживать свою валюту.

Действие долговременных факторов вновь стало доминировать. Валютные поступления Беларуси в январе–апреле составили 10,6 миллиарда долларов и снизились по сравнению с аналогичным периодом прошлого года на 3,17 миллиарда. Экспорт в целом упал на треть, импорт – на четверть. Только в Россию экспорт белорусских товаров снизился на 37,5%. Сократился на 23,6% и экспорт в страны ЕС. Вместе с белорусским рублем обваливается и российский.

Из-за снижения цен на нефть и обострения конфликта в украинском Донбассе российский рубль покинул, казалось бы, насиженную отметку в 50 денежных единиц за доллар и подскочил до 55–56 рублей за «зеленый». Соответственно евро поднялся до 62–63 рублей. Не последнюю роль в этом сыграло заявление Центробанка России о том, что в ближайшие годы он планирует нарастить свои золотовалютные резервы на 140 млрд долларов, с тем чтобы вернуться на отметку 500 миллиардов (до кризиса на 1 января 2014 года они составляли 509,6 миллиарда долларов).

Белорусская валютно-фондовая биржа перешла на новую форму проведения торгов – на так называемый непрерывный двойной аукцион, когда участники торгов выставляют заявки на покупку валюты и ее продажу по собственным обнародованным курсам. И сделка заключается при совпадении цен продавцов и покупателей. Чтобы не было неожиданностей в виде резкого изменения котировок белорусского рубля в неблагоприятную сторону, перед началом торгов по новым условиям Нацбанк на всякий случай принял некоторые превентивные меры по ограничению спроса на валюту. Накануне первых торгов 1 июня он изъял из обращения 10 триллионов рублей как излишнюю ликвидность у коммерческих банков. 3 июня был проведен очередной аукцион по размещению государственных краткосрочных облигаций, которые эмитирует Министерство финансов в основном для банков, на сумму 4 трлн рублей, что позволило также стерилизовать излишнюю рублевую массу. Если бы не эти меры, то девальвация белорусского рубля могла бы быть значительнее. Попытки денежных властей ограничить спрос на валюту свидетельствуют о размягчении монетарной политики Нацбанка в сравнении с январем-февралем, что подтверждает возросшая положительная динамика рублевой денежной базы. В этой связи эксперты прогнозируют дальнейший рост курса доллара.

Белорусская экономика перешла из состояния стагнации (застоя) в процесс рецессии (падения). ВВП снизился на 2,6%, а к концу года на фоне продолжающегося роста безработицы ожидается его снижение на 3,5%. В августе надо найти 1 млрд долларов на погашение пятилетних евробондов Минфина, а Россия новых валютных кредитов не дает. Согласилась только на пролонгацию (читай – отсрочку) погашения старых. На саммите в Германии страны группы G7 подтвердили, что отменять экономические санкции против России до конца года не собираются вследствие невыполнения российским руководством Минских соглашений по Украине, а могут в связи с усилением военных столкновений их только усилить. Примечательно заявление министра финансов России в С.-Петербурге «Пятому каналу»: *«Вот если все будет так, как сейчас, то нам 2–3 года точно потребуется для того, чтобы не жировать».* Надо ли напоминать, что белорусская экономика всецело зависит от состояния дел в экономике восточной соседки? Но текущий год в Беларуси, как известно, год выборов президента. И если у исполнительной власти появится старый соблазн подтолкнуть Нацбанк разогреть печатный станок, чтобы не простаивали предприятия, а увеличивали и без того рекордные запасы продукции на складах, то за курс белорусского рубля я лично не ручаюсь.

ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО

Белорусы не нуждаются в ваших советах, господин Посол!

Чрезвычайному и Полномочному Послу Российской Федерации в Республике Беларусь ***А.А.СУРИКОВУ***

Генеральному прокурору Республики Беларусь ***А.В.КОНЮКУ***

10 июня 2015 года в новостях БТ было показано выступление посла России в Беларуси. В нем господин Суриков высказался по поводу президентских выборов в нашей стране. Он заявил, что, кроме Александра Григорьевича Лукашенко, достойных кандидатов в президенты РБ он не видит и Россия будет поддерживать его кандидатуру и поможет для этого разгрузить складские запасы.

Перед предыдущими президентскими выборами в Беларуси на официальных российских телеканалах показывали четырехсерийный фильм «Крестный Батька», в котором Александр Григорьевич представлялся далеко не с положительной стороны.

У смотрящих ваши опусы белорусских телезрителей возникает вопрос: когда Россия прекратит вмешиваться во внутренние дела суверенного государства и давать свои оценки по кандидатурам?

Всем известно, чем закончилась авантюра с выдвижением и поддержкой со стороны России кандидатуры уголовника Януковича в президенты Украины. Что это будет, если послы разных государств в открытую или втихую будут навязывать свои креатуры? Пример – конфликт в Украине, не без вмешательства внешних сил!

Граждане Беларуси не нуждаются во вмешательстве внешних сил в избирательный процесс, у нас много умных, достойных кандидатов, которым по силам возглавить государство и остановить рост коррупции, рост цен, инфляцию, девальвацию, внести изменения, позволяющие улучшить благосостояние граждан, сохранить мир!

Мы требуем от вас, господин Суриков, не нарушать Избирательный кодекс Республики Беларусь и уважать наш суверенитет. Вы лучше посоветуйте своему руководству прекратить международный разбой и наладить добрососедские отношения со всеми государствами, вследствие чего с вашего государства будут сняты политические и экономические санкции, что облегчит тяготы россиян.

Алексей ПАВЛОВСКИЙ,
Сергей БРИТИКОВ,
Наталья КОЛОНИЦКАЯ,
Михаил ТАДОРКО,

Галина ЛИСИЦЫНА,
Юрий ДОРОШЕНКО
и другие жители Могилева
(всего 120 подписей).

З-ЗА КРАТАЎ

Мікалай СТАТКЕВІЧ:

«Мяне спрабавалі ўгаварыць адмовіцца ад адзіночкі»

У сваім чарговым лісце з-за кратаў былы кандыдат у прэзідэнты Мікалай Статкевіч выказаў свае асцярогі наконт чарговай кампаніі па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая павінна распачацца ў хуткім часе.

У прыватнасці, Статкевіч піша: *“Калі ўжо казаць пра тыя выбары і падрыхтоўку да іх дэмакратычных сіл, то сітуацыя выглядае сумнай. Робіцца рэальнай перспектыва міжнароднай легітымізацыі. Для гэтага зараз дастаткова прадэманстраваць толькі “заўважны прагрэс”. Гэта значыць, паставіць меншы працэнт і праігнараваць мажлівую акцыю пратэсту. Калі яна будзе. Карацей кажучы, план, які рыхтаваўся ў 2010 годзе, але быў сарваны, цяпер мае добрыя шанцы. Супрастаяць яму ніхто з кандыдатаў і не збіраецца. Ды і “адмазка” ёсць – Расія”.*

Што тычыцца ўмоў адбыцця пакарання, то Мікалай Статкевіч паведаміў: *“Газеты да мяне сталі даходзіць толькі два апошнія тыдні і то не ўсе выпісаныя”.*

Палітвязень адзначае, што ў яго ўсё нармальна і ён адчувае сябе добра. *“Тут усё спрабавалі ўгаварыць мяне адмовіцца ад адзіночкі. Ну, калі так неабходна ведаць мае думкі, то проста трэба даваць тэлефанаваць блізкім і не забіраць лісты да мяне, каб я часцей ліставаўся. І будзе ім шчасце”*, – з гумарам адзначае палітвязень.



Стыхія «накрыла» Гомель





У другой палове дня ў нядзелю стыхія абрынулася на Гомель. Па дажджы надвор’е, відаць, вырашыла выканаць месячную норму. Такая колькасць ападкаў у спалучэнні з моцным ветрам не абышлася для горада без наступстваў. Паводле слоў відавочцаў, вада зацякала нават у праязджаючыя аўтобусы. З дахаў злятаў шыфер, у дамах выбівала шкло, валіліся дрэвы...

РЭЙТЫНГ

У дзясятцы найгоршых

Міжнародная канфедэрацыя прафсаюзаў уключыла Беларусь у дзясятку горшых для працоўных краін.

У гэтым антырэйтынгу наша краіна размясцілася па суседстве са Свазілендам і Гватэмалай. Таксама ў спісе найгоршых апынуліся Катар, Егіпет, Калумбія, Кітай, Аб’яднаныя Арабскія Эміраты, Пакістан і Саудаўская Аравія.

Беларусь трапіла ў спіс з фармулёўкай, што *“гэта дзяржава, у якой не гарантуецца захаванне правоў працоўных”.*

ВІНШУЕМ!

Як датчане дапамаглі беларускім гандбалістам

Мужчынская зборная Беларусі па гандболе чацвёрты раз запар будзе выступаць на чэмпіянаце Еўропы па гандболе.

У мінулую нядзелю адбыліся заключныя матчы адборачнага турніру мужчынскага першынства Еўропы-2016.

У сваёй групе беларуская каманда даволі ўпэўнена перамагла літоўцаў – 31:24, але, каб заваяваць другое месца і пуцёўку на еўрапейскі чэмпіянат, неабходна была яшчэ і перамога датчан над зборнай Босніі і Герцагавіны. І датчане беларусаў не падвялі, яны перамаглі баснійцаў з лікам 26:25.

Такім чынам, нашы гандбалісты чацвёрты раз запар прабіліся на топ-турнір. Чэмпіянат Еўропы пройдзе 15–31 студзеня 2016 года ў Польшчы.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ВІЗІТ

У Мінск прыбылі кіраўнікі АБСЕ

Учора ў Мінск прыбылі генеральны сакратар АБСЕ **Ламберт Заньер** і кіраўнік Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ **Міхаэль Георг Лінк.**

Візіт запланаваны як двухдзённы. Асноўныя сустрэчы павінны адбыцца сёння, у тым ліку – з міністрам замежных спраў **Уладзімірам Макеем** і іншымі афіцыйнымі асобамі. Лёгка здагадацца, што адной з галоўных тэм стануць будучыя прэзідэнцкія выбары. БДІПЧ – тая арганізацыя, якая ад Еўропы накіроўвае назіральнікаў за выбарамі і якая пасля 1996 года ніводнага разу не прызнала вынікі беларускіх выбараў.

ПАЛІТКУХНЯ

Не ўдзельнічаць, не падтрымліваць

Калі Міністэрства юстыцыі нарэшце зарэгіструе ствараемую партыю «Беларуская хрысціянская дэмакратыя», то яе сустаршынямі будуць Павел Севярынец, Віталь Рымашэўскі і Георгій Дзмітрук. Адпаведнае рашэнне прынята дэлегатамі ўстаноўчага з’езда партыі, які ў мінулыя выхадныя прайшоў у Мінску.

Першы ўстаноўчы з’езд прайшоў у 2009 годзе, у 2010-м – яшчэ два. Апошняя спроба рэгістрацыі была зроблена ў снежні 2011 года.

Што тычыцца ўдзелу ў будучых прэзідэнцкіх выбарах, то хрысціянскія дэмакраты прынялі рашэнне не вылучаць свайго кандыдата і не падтрымліваць нікога.

«У сітуацыі адсутнасці адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл мы не будзем вылучаць свайго кандыдата, а таксама падтрымліваць кагосьці публічна. Для нас кампанія, якую рыхтуюць Лукашэнка і Ярмошына, не выбарчая, а палітычная. Мы будзем праводзіць кампанію салідарнасці з Мікалаем Статкевічам і ўсімі палітзняволенымі», – адзначыў Павел Севярынец.

ИЗ ЗАЛА СУДА

Сергей СИДЬКО:

«...Тогда оперативники решили, что я съел эти деньги»

Интересная особенность: в Беларуси, когда человек занимает высокий пост, то он излучает убежденность, что у нас правовое государство и все делается по закону. Но как только у него самого возникает конфликт с правоохранительной системой, то начинаются другие речи.

Напомним, что в Верховном суде продолжается процесс по делу бывшего председателя «Белкоопсоюза» Сергея Сидько. Вот что он поведал суду об обыске у себя дома.


«Обыск продолжался 22 часа, – рассказал обвиняемый. – *Ордера на обыск не было, его привезли позже, когда дочь начала возмущаться. Меня и членов семьи (жену, дочь, внучку) раздели и осмотрели. Потом вызвали сотрудников МЧС, чтобы проверить, не спрятал ли я взятку в вентиляционных отверстиях. Ничего не нашли. Вызвали сантехника, который снял унитаз, прочистил стояк. Опять ничего нет. Дальше приехали две ассенизаторские машины, которые откачали воду из канализации, но и там ничего не было. Тогда оперативники решили, что я съел эти деньги. Меня привезли в поликлинику КГБ, где сначала проверили на рентгене, потом заставили проглотить зонд. Этого им показалось мало. Меня поместили в изолятор, дали ведро, в которое я должен был ходить в туалет. Восемь дней его не выносили, хотя температура воздуха в помещении доходила до 35 градусов. Потом испражнения отправили на экспертизу, которая показала, что денег и там нет...»*

Так ли все было, не так – выяснит суд, если его это заинтересует. Важно, видимо, другое – насколько глубок конфликт самого Сидько с законом? Следствие инкриминирует ему очень серьезные преступления. Недалек тот день, когда свое слово скажет СУД.

ФУТБОЛ

«Крыўдны гол»

У матчы кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы футбалісты зборнай Беларусі на “Барысаў-Арэне” прайгралі камандзе Іспаніі з мінімальным лікам – 0:1.



Пачатак быў за іспанцамі. Складвалася ўражанне, што на беларусаў магічна падзейнічаў аўтарытэт гасцей, але час ішоў, і беларускія футбалісты паступова пачыналі разумець: усё ж такі яны гуляюць на сваім полі. Тым больш крыўдным аказаўся гол у вароты беларусаў напрыканцы першага тайма. Памыліўся наш варатар Андрэй Гарбуноў, і Давід Сільва свой шанц выкарыстаў на ўсе сто.

А вось беларусы ў другім тайме прадастаўленай магчымасцю зраўняць лік не скарысталіся, хоць увогуле іх гульня пакінула добрае ўражанне.

“Не наклалі ў штаны”, – вобразна пракаментаваў паядынак ігрок беларускай зборнай **Аляксандр ГЛЕБ.**

“Мне вельмі спадабаўся футбол, – радасна дадаў старшыня Беларускай федэрацыі футбола **Сяргей РУМАС.** – *А якая атмасфера была! Людзі нават пасля матча не хацелі пакідаць стадыён”.*

Да слова, на гульні на самай справе быў аншлаг. Праўда, футбаліст **Павел Няхайчык** адзначыў, што *“пры сённяшніх адносінах беларускай міліцыі да балельшчыкаў складана вярнуць іх на трыбуны”.*

“Падчас гэтага матча, здаецца, усё было нармальна, – распавёў ён журналістам. – *Але, калі мы ехалі перад гульнёй на трэніроўку, сутыкнуліся з тым, што супрацоўнікі міліцыі пачалі пытацца: “Хто вы? Што вы?» Яны яшчэ думалі, ці пускаць футбалістаў нацыянальнай каманды на трэніроўку. Гэта поўная бязглуздзіца! Затое, безумоўна, прыемна, калі аматары футбола не пакідаюць стадыён пасля фінальнага свістка. Будзем старацца радаваць іх і надалей”.*


Наступны матч кваліфікацыі зборная Беларусі правядзе 5 верасня ў гасцях з камандай Украіны.

Становішча каманд у групе пасля 6 тураў: Славакія – 18 ачкоў, Іспанія – 15, Украіна – 12, Беларусь – 4, Македонія – 3, Люксембург – 1.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ГАЗЕТА – ЧЫТАЧЫ

Калі ты прагнеш лепшай долі – Дапамажы “Народнай Волі”. У свеце праўды жыць імкніся – І на газету падпішыся!



Аформіць падпіску на другую палову 2015 года можна ў любым паштовым аддзяленні, а мінчане маюць яшчэ і магчымасць зрабіць гэта ў спецыялізаваных пунктах “Белсаюздруку”. У шапіках Вашы экзэмпляры газеты будуць чакаць Вас нават тады, калі Вы з’едзеце, скажам, у камандзіроўку, на адпачынак альбо на лецішча.

Маеце нагоду падрыхтаваць падарунак для бацькоў, сваякоў, сяброў, саслужыўцаў? Што ж, лепшы сюрпрыз – падпісны квіток на “Народную Волю”.

Адным словам,
Вы – з “Народнай Воляй”,
“Народная Воля” – з Вамі!

ТРАГЕДЫЯ



Носам у зямлю

Крымінальная справа распачата па факце падзення самалёта ў Брэсцкім раёне на падставе ч.3 арт.314 КК (парушэнне правілаў бяспекі руху або эксплуатацыі чыгуначнага, паветранага, воднага транспарту або метрапалітэна, што пацягнула па неасцярожнасці смерць дзвюх ці больш асоб).

Пра гэта паведаміла афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Беларусі **Юлія Ганчарова.**


Устаноўлена, што ў нядзелю 14 чэрвеня прыблізна ў 12.00 блізу вёскі Хабы Брэсцкага раёна пры выкананні планавага палёту здарылася падзенне паветранага судна Іл-103, што належыць РУП «Беллесавія».

Іл-103 разбіўся за некалькі кіламетраў ад брэсцкага аэрапорта пры выкананні палётнага задання па выяўленні пажараў. Загінулі камандзір паветранага судна Міхаіл Мядзведзеў і старшы лётчык-назіральнік Аляксандр Барысюк. Працу следчай групы на месцы падзення каардынаваў намеснік старшыні СК Сяргей Буйноўскі.

ПА-ЗА КОРТАМ

Вікторыя Азаранка скупляе нерухомасць

Да чатырохпакаёвай кватэры ў Мінску былая першая ракетка свету зараз дадала і дом у Лос-Анджэлесе за 7 мільёнаў долараў.





Дом Вікторыі Азаранка ў Лос-Анджэлесе і домік у Вілейскім раёне.

У СМІ з'явілася інфармацыя, што беларуская тэнісістка **Вікторыя Азаранка** купіла ў Лос-Анджэлесе дом за 7 мільёнаў долараў.

Плошча трохпавярховага дома складае каля 400 квадратных метраў, у ім некалькі спальняў, ліфт, чатыры ванныя пакоі.

Дарэчы, гэта не адзіная маёмасць, якой валодае Азаранка.

"Па-першае, Віка арандуе кватэру ў Манака, – распавяла "Народнай Волі" маці спартсменкі **Ала АЗАРАНКА.** *– Набыць жыллё там неверагодна дорага – квадратны метр даходзіць да 80–100 тысяч еўра! Так што, як правіла, усе тэнісісты, якія захацелі стаць рэзідэнтамі Манака, здымаюць кватэры. Новак Джокавіч, Каралін Вазняцкі, Дзінара Сафіна... У Манака ў дачкі акуратная кватэрка, але я хачу сказаць, што людзям, якія прызвычаіліся да пастаянных раз'ездаў, гламурнасць не патрэбна. Галоўнае, каб было чыста, спакойна і ўтульна. А вось у Мінску Віка некалькі гадоў таму купіла чатырохпакаёвую кватэру, якая пасля перапланіроўкі на амерыканскі лад стала трохпакаёвай. Таксама ў сталіцы будуем дом... Дарэчы, набылі лецішча з лазняй і на Вілейскім вадасховішчы, у пасёлку Рабунь. Вада, свой участак – Манака і побач не стаяла! Віка з задавальненнем туды прыязджае. А шыкоўнае лецішча дачка не захацела. Навошта? І для каго? Паказаць, колькі ў яе грошай? Ты будуеш жыллё для сябе, а не для таго, каб паказаць суседзям, які ты круты".*

Алесь СІВЫ.

УВАГА!

АГП запрашае на талаку ў Курапаты

16 чэрвеня, у Дзень салідарнасці з беларускімі палітвязнямі, а таксама зніклымі палітыкамі і грамадскімі дзеячамі, Аб'яднаная грамадзянская партыя запрашае сябраў партыі і сваіх прыхільнікаў узяць удзел у талацэ.

Партыя заклікала зрабіць свой унёсак у захаванне нацыянальнай памяці, у выратаванне мемарыяла Курапаты.

Нагадаем, што ўрочышча Курапаты – месца масавых расстрэлаў і пахаванняў ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

16 чэрвеня, у аўторак, праца пачнецца а 17-й гадзіне і працягнецца прыкладна да 20.00. Збор у Курапатах у канцы алеі крыжоў на вяршыні ўзгорка.

БЕЗ ГАЛСТУКА

Начальник минской милиции лично "отбил" у злоумышленника барсетку

Поход в гипермаркет для начальника минской милиции Александра Барсукова обернулся исполнением профессиональных обязанностей.

Как сообщает сайт ГУВД Мингорисполкома, генерал-майор Александр Барсуков на стоянке рядом с одним из гипермаркетов заметил оставленную кем-то в тележке барсетку.

Этот аксессуар заметил и некий человек, проходивший мимо. Мужчина схватил барсетку, спрятал ее за пазуху и бросился бежать, чем вызвал подозрение у начальника минской милиции. Задержать похитителя Барсукову удалось за пределами стоянки.

О забытой в магазинной тележке барсетке ее владелец узнал только от позвонившего оперативного дежурного Фрунзенского РУВД. Там же ему рассказали, что возвращению потери поспособствовал именно начальник минской милиции. Поблагодарить Барсукова минчанин приходил в ГУВД.

Ранее Александр Барсуков занимал должность начальника департамента исполнения наказаний (ДИН) МВД Беларуси, а до этого был первым заместителем начальника главного управления охраны правопорядка и профилактики МВД. Возглавляет столичную милицию с октября 2011 года.

Барсуков лично присутствовал на всех акциях протеста в Беларуси и был одним из тех, кто отдавал приказы о разгоне многочисленных демонстраций, которые проходили в последние годы.

ВЕРИТЬ–НЕ ВЕРИТЬ

Белорусское молоко станет вкуснее

В Беларуси будут ужесточены условия производства молока, заявил заместитель министра сельского хозяйства и продовольствия **Игорь Брыло.**

С 1 сентября нынешнего года в Беларуси начнет действовать новый госстандарт на молоко, в соответствии с которым число соматических клеток в 1 мл молока не должно превышать 500 тысяч, в сорте экстра – 300 тысяч.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Мікалай Аўтуховіч:

«Плюнулі ў душу»...



Былыя палітвязні і блізкія тых, хто і цяпер знаходзіцца за кратамі, абураны і нават шакіраваны заявамі Алены Красоўскай-Каспяровіч, якая пасля асуджэння Андрэя Бандарэнкі з'яўляецца фактычным кіраўніком праваабарончай арганізацыі«Платформа».

Нагадаем: у сваім інтэрв'ю яна, у прыватнасці, сказала: *«Я не лічу, што ў дачыненні да палітвязняў ёсць асаблівае стаўленне, што іх там прэсуюць. Проста нашы палітвязні не прывыклі да таго, што яны знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. Зразумела, усім там дыскамфортна... Калі ты трапіў туды за нейкае дзеянне, то ўжо не ный, што называецца».*

Адказаць Алене вырашыў Мікалай Аўтуховіч, былы палітычны зняволены, які выйшаў на свабоду з Гродзенскай турмы толькі 8 красавіка 2014 года.

– Заявы пра тое, што ў беларускіх турмах адбыліся змены ў лепшы бок, ставяць заяўнікаў гэтага ў дурное становішча. У краіне жыць становіцца толькі цяжэй, а ў месцах пазбаўлення волі раптам стала лепш?! Каб гаварыць пра тое, лепш там ці горш, трэба ведаць, як там было раней. Лена (**заўв.:** *Алена Красоўская-Каспяровіч*) пабывала ў многіх калоніях, прыязджаючы на спатканні да мужа, і таму яна лічыць, што можа рабіць такія параўнанні і такія заявы. Ёй паказалі склад з прадуктамі, і яна заяўляе пра тое, што «зэкаў» карміць сталі лепш. Я проста шакіраваны такімі высновамі.

У турмах асуджаных ужо каля чатырох гадоў кормяць па норме №3 (норма, па якой кормяць падследных, якія знаходзяцца ў СІЗА і турмах) замест нормы №1, па якой павінны карміць менавіта асуджаных. Я ўзнімаў гэтае пытанне, знаходзячыся ў турме, і пісаў пра гэта ў сваім лісце ў «Народную Волю». Але зараз адбываецца тое ж самае – пайка зрэзана па многіх пазіцыях. Пытанне ж не ў тым, што ёсць на харчовых складах, пытанне ў тым, што трапляе на стол асуджанага. Усім асуджаным знаёма сітуацыя, калі ў месца пазбаўлення прыязджае якая-небудзь камісія з праверкай, і ззкі дзівяцца багаццю мяса ў кашы і якасці прыгатаванай ежы. Але гэта доўжыцца адзін-два дні, пакуль камісія не наведае сталовую.

Што тычыцца рамонтаў у месцах пазбаўлення волі, то трэба ведаць, што яны робяцца за грошы асуджаных або іх родных. Колькі я знаходзіўся па той бок дроту, заўсёды было так. А што змянілася цяпер? Можа, нехта паверыць у словы Лены, але толькі не тыя, хто спазнаў гэта на ўласнай скуры, і не іх родныя.

Што змянілася ў нашай краіне, каб у турмах раптам людзі сталі жыць, як у піянерскім лагеры?..

Каманда «Платформы» кінула выклік усяму грамадству, плюнула ў душу многім людзям, якія ведаюць пра рэальнае становішча спраў у месцах пазбаўлення волі. Мне шкада, што Мікіта Ліхавід – былы палітычны зняволены, цяпер супрацоўнік «Платформы», які сам пабыў на зоне, – апынуўся ў гэтай кампаніі адбельвання карнай сістэмы. Хіба можа змяніцца сітуацыя ў турмах, пакуль там працуюць тыя людзі, якія ламалі лёсы іншых, пакуль Дэпартаментам выканання пакаранняў кіруюць людзі, пры якіх да нас у камеры закідвалі зэкаў з нізкім сацыяльным статусам, каб прынізіць годнасць чалавека; пры якіх накладвалі надуманыя абвінавачванні і раскручвалі па 411-м артыкуле новы тэрмін для Дзімы Дашкевіча, Мікалая Дзядка і многіх іншых.

Я да гэтага часу маю зносіны з людзьмі з месцаў пазбаўлення волі і не магу ім не давяраць. Лепш у калоніях дакладна не стала. Людзей практычна пагалоўна зугналі на працу, яны ў прымусовым парадку гарбацяцца за капейкі. І гэта непрыхаваная форма рабства.

Калі б я ніколі не сядзеў у беларускіх калоніях і турмах, я ўсё роўна не паверыў бы гэтаму дакладу прадстаўнікоў «Платформы». Тое, пра што яны гавораць, – з вобласці фантастыкі. Бо Дэпартамент выканання пакаранняў з'яўляецца звяном у ланцугу таталітарнай сістэмы. Калі людзі на волі не могуць знайсці праўды і справядлівасці, то за калючай агароджай гэта зрабіць у дзесяць разоў больш складана. І не выпадкова начальніка калоніі ва ўсе часы называлі «гаспадаром».

У мяне сабрана вельмі шмат матэрыялу, фактаў бясчынства з боку адміністрацыі. І ўсё ж хачу адзначыць, што ў месцах пазбаўлення волі працуюць і прыстойныя людзі, якія ведаюць, што такое гонар і годнасць. Але яны проста не ў сілах супрацьстаяць гэтай сістэме зла.

ОТКЛИК

Какие нужны тюрьмы...

Эта статья – мой отклик на недавнее интервью с Аленой Красовской-Касперович, которая сейчас руководит «Платформ инновейшен».

Алену Красовскую-Касперович я знаю с 2010 года, когда мой муж попал за решетку. Тогда она еще не была директором правозащитной организации, но очень помогала мне лично и другим женщинам – своими советами и неиссякаемым оптимизмом. Алена всегда выступала за то, что нужно отстаивать права своих родственников, находящихся в заключении, не бояться идти с боем на администрацию, в Департамент исполнения наказаний и прокуратуру. Личным примером она тогда вдохновила многих на борьбу с беспределом и оказала неоценимое влияние на меня лично.

Алена действительно никогда не считала, что бывают лучшие или худшие заключенные – там все равны, говорила она. Прошло пять лет, и я с удивлением читаю ее впечатления о поездках по колониям. Я не буду размышлять о теории заговора и о том, почему сидят бывшие лидеры «Платформы» и почему именно эта организация получила возможность посещать колонии. Я не буду защищать своего мужа и утверждать, что ему там хуже, чем остальным. Я просто прокомментирую некоторые моменты последнего интервью Алены.

Самым ярким моментом для многих явилась позиция Алены по политзаключенным. Я соглашусь с ней в одном: в какой-то мере политзаключенные действительно находятся в более привилегированном положении по сравнению с другими заключенными – у них есть доступ к мощным информационным и дипломатическим ресурсам, но именно это положение помогает жителям Беларуси и всего мира узнать о том, что творится в тюрьмах.

Да, действительно, методы, применяемые к политзаключенным, – не что-то исключительное, они применяются ко всем неугодным заключенным. И именно об этом нужно говорить. У обычных заключенных нет голоса, нет возможности передавать информацию, встречаться с адвокатами, писать книги и получать за них награды. Поэтому важно за голосом политзаключенных разглядеть не их личную проблему, а коллективный крик о помощи.

И всякий раз, когда я узнаю о том, что моего мужа помещают в нечеловеческие условия, я понимаю, что в эту самую минуту по всей стране сидят такие же люди, только к ним не приезжает адвокат, а их родственникам не звонят журналисты. Потому что эти люди никому не интересны.

Да, не нужно все внимание сосредотачивать на политзаключенных, делать из них мучеников (при том, что сами они этого клейма меньше всего), но мы обязаны использовать их как канал информации. И если этот канал не интересует правозащитную организацию, тогда я не знаю, что им вообще интересно.

Алена не говорит о правах заключенных. Она говорит о евроремонтах, складах с продуктами, внешнем виде комнат свиданий. Да дураку понятно, что никакая золотая клетка не заменит человеку свободу и не перевесит унизительного отношения к себе.

Я не представляю себе заключенного, который бы жаловался на то, что у него старая тумбочка или недостаточно новая роба. Заключенные жалуются на температуру в камерах, на то, что им на голову капает вода, на то, что врачи не оказывают надлежащей медицинской помощи, на отношение к себе, как к скоту. В отчетах же «Платформы» речь идет только о физических условиях содержания.

Кстати, интересно сравнить эволюцию организационной политики «Платформы». Ровно три года назад на сайте учреждения появилась критика отчета о посещении колонии Республиканской наблюдательной комиссией, который состоит из перечисления «благ цивилизации», которые комиссия увидела при посещении. Потребовалось всего лишь три года, чтобы сами платформовцы начали кормить нас такими же текстами.

Особого внимания заслуживает высказывание, что некоторые тюрьмы нужно снести и... «на их месте построить новые»! Вот чего нам не хватает – больше тюрем с евроремонтом!

Они не хотят понять, куда попали, это не санаторий. Примерно такими же словами выражалась прокурор на последнем процессе моего мужа. А Алене не приходило в голову, что могут быть люди, которые не считают, что сидеть в робе в 30-градусную жару в камере – нормально, что работать сверхурочно за копейки – нормально? Что годами болеть хроническими болезнями без обследования – нормально? Кому, как не правозащитнику, знать, что к человеку и в тюрьме должны относиться как к человеку?

Заявление о том, что они общались с заключенными и все как один отказались жаловаться, вообще вызывает искреннее недоумение. Кому, как не Алене, знать, что за любое слово после отъезда комиссии с заключенными расправляется администрация? Да, их больше не бьют (а я склонна верить, что эти случаи просто не известны), но лишить УДО, свидания, передачи – запросто!

Неужели вы верите, что заключенные будут жертвовать своим и без того зыбким положением, чтобы «Платформа» написала о них на своем сайте? На это идут люди, которым уже нечего терять или у которых есть ресурсы, например, политзаключенные.

Никита Лиховид, говорит Алена, возмущался пять лет назад, а политзэки ноют до сих пор. Может, потому, что они до сих пор сидят?

Возможно, кого-то удивило высказывание Алены о политзаключенных, но не меня. Она всегда имела такую точку зрения о политзаключенных и обычных заключенных, просто журналисты стали спрашивать об этом только сейчас. Я не думаю, что она транслирует навязанное мнение – уверена, это ее личное убеждение.

Что следует из этого вынести, так это то, что Алена выражает мнение абсолютного большинства белорусов: что существование тюрем необходимо и полезно; что увеличение сроков можно решить проблему преступности; что преступников нужно сажать, и все они там не просто так, что раз попались – пусть терпят любые издевательства, это ведь не санаторий!

Опасность Алены состоит не в том, что она поддерживает это мнение, но, используя свои медийные и административные ресурсы, она еще и укрепляет данные предрассудки.

Всем, кто хоть каким-то боком сталкивался с пенитенциарной системой или знаком со статистикой, известно, что тюрьмы не выполняют воспитательной и предупреждающей функции. Они попросту не могут этого сделать, потому что корень проблемы кроется не в конкретных личностях, попавших за решетку, а в самом обществе и властных отношениях.

Начнем с того, что абсолютно все законы инициируются не народом, а навязываются властью. Сделать преступником можно кого угодно хоть завтра одним росчерком пера. Так, знаменитый закон о тунеядстве в один день превратил в нарушителей полмиллиона людей. Большинство законов об экономических преступлениях представляет собой современный аналог рэкета: не захотел делиться – сидеть!

Во-вторых, любое преступление имеет глубинные причины, не разобравшись с которыми ничего не изменишь.


За каждым уклонистом от уплаты алиментов стоит отсутствие культуры осознанного родительства и ответственности, культуры семейных отношений, культуры необходимости планирования семьи и контрацепции. Все это подгоняется призывом рожать по трое детей за деньги со стороны государства и общественным мнением, которое считает калекой каждого, кто не родил ребенка и не завел семью до 25 лет. Неважно как – роди и заведи!

За каждым участником массовых беспорядков стоит внутреннее восстание против многочисленных структур угнетения, которые преследуют нас повсюду, против подавления воли и инициативы, желание изменить свою жизнь и нежелание больше следовать навязанным сверху правилам. И пока это останется так, беспорядки будут происходить, сколько людей за них ни посади.

За каждым мелким наркоторговцем стоит культивируемая в обществе жажда легкой наживы, потребительское отношение к другим людям, желание убежать от проблем в мир, где тебя ничего не трогает. Добавим сюда слаженную работу правоохранительных органов, отправляющих в тюрьмы мелких сошек и никогда не трогающих крупных наркодилеров.

Нет смысла описывать каждое преступление. Можно со мной не соглашаться, но статистика рецидивов и неуменьшающаяся армия новоиспеченных осужденных еще раз доказывают мои слова. Более полно мои тезисы раскрыты в статье «Преступление и наказание, или Размышления о пенитенциарной системе».

Существование организаций, занимающихся правами заключенных, – это просто бесценно и необходимо. Однако нам, видимо, еще предстоит дожить до организации, которая будет на самом деле заниматься и продвигать эти права. А пока борьба против беспредела будет продолжаться одиночками, имена которых мы, возможно, никогда не узнаем.



Валерия ХОТИНА, анархистка, жена политзаключенного Николая Дедка.

ПРАБЛЕМА!

«Дом Юрыя Чыжа», гатэль «Кемпінскі»... Працягу не будзе?

Калі ў сталіцы будавалі гасцініцу "Пекін" і сталі высякаць суседні парк, мінскія анархісты вынайшлі арыгінальную форму змагання. У дрэвы сталі забіваць цвікі. Пры спробе спілаваць дрэвы, электрычныя пілы ламаліся. Гэткім чынам моладзь змагалася з бескантрольнай забудовай Мінска, якая пачалася ў апошнія гады.

Ахвярай гэтай палітыкі стала адна з галоўных мінскіх каштоўнасцяў – водна-зялёны дыяметр. Гаворка ідзе пра сістэму штучных і натуральных вадаёмаў, якая працягнулася праз увесь Мінск. Пра яе ўнікальнасць сведчыць наступны факт: Вілейская-Мінская водная сістэма, якая стала "донарам" для дыяметра, была ўключана ў Сусветную энцыклапедыю архітэктуры (выдадзена ў 2000 годзе ў Нью-Ёрку).

Вядома, існавала альтэрнатыва: пашыраць Мінск за кошт земляў, якія выкарыстоўваліся для патрэб сельскай гаспадаркі. Але пасля выказвання **Аляксандра Лукашэнкі** (у 2013 годзе ён заявіў: "Сельскагаспадарчыя землі – гэта практычна забарона. Лепш падрэзаць лес, чым займаць землі сельгаспрызначэння") актыўнасць інвестараў скіравалася ў бок зялёных масіваў. Вынік вядомы ўсім. Гэта і гучныя скандалы з гатэлямі "Пекін" і "Кемпінскі", і больш лакальныя канфлікты ў самых розных мікраёнах горада. Напрыклад, некалькі гадоў таму забудоўшчыкі паспрабавалі знішчыць у Курасоўшчыне яблыневы сад. Мясцовым жыхарам спатрэбілася сабраць 5,4 тысячы подпісаў, каб сад быў захаваны.

Восенню гэтага года павінен быць распрацаваны праект карэкціроўкі генеральнага плана Мінска. Як адзначае **Дзяніс Кобрусеў**, прадстаўнік грамадскай ініцыятывы "Еўраперспектыва", Мінгарвыканкам адмовіўся ўключыць у камісію па распрацоўцы плана прадстаўнікоў грамадскасці. Хоць і згадзіўся на грамадскае абмеркаванне праекта. Але на яго будзе адведзена ўсяго 25 дзён. Відавочна, што гэтага занадта мала, каб жыхары сталіцы змаглі выказаць свае прапановы.

Тады "Еўраперспектыва" звярнулася ў праектна-даследчае прадпрыемства "Мінскграда", якое распрацоўвае план. І – о, цуд! – шэраг ініцыятыў быў падтрыманы. "Мінскграда" згодна, што капітальныя збудаванні ў цэнтральных парках горада могуць займаць не больш за 7% тэрыторыі. Паркі, што змешчаны ў так званых "спальных" раёнах, павінны быць заняты раслліннасцю не менш як на 80%. У лесапарках забароняць размяшчаць рознага кшталту забаўляльныя цэнтры, а ў ландшафтна-рэкрэацыйных зонах – будаваць гатэлі і жылыя дамы. Забароняць узводзіць капітальныя будынкі і на тэрыторыі сталічных прыродных заказнікаў (напрыклад, у заказніку "Лябяжы", што ў Драздах).



Дзяніс Кобрусеў настроены досыць аптымістычна: *"З атрыманых адказаў мы зразумелі, што дзяржаўныя органы пачалі прыслухоўвацца да грамадскасці і экспертаў па важных пытаннях развіцця горада Мінска".*

Праўда, яго калегі адзначаюць: калі б заўвагі былі прыняты пяць гадоў таму, ні "Кемпінскі", ні "дом Юрыя Чыжа" ля Траецкага прадмесця, ні жыллёвы квартал каля Нацыянальнай бібліятэкі не пабудавалі бы.

"Еўраперспектыва" будзе дабівацца, каб водна-зялёны дыяметр атрымаў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, што ахоўваецца дзяржавай. Таксама прадстаўнікі ініцыятывы рыхтуюцца да абмеркавання новай версіі генеральнага плана Мінска. Цяперашні план прадугледжвае будаўніцтва трасы праз Севастопальскі парк, стварэнне трэцяга транспартнага кола, якое пройдзе на роўнааддаленасці паміж вуліцай Арлоўскага і Кальцавой дарогай, а таксама жыллёвае будаўніцтва на поўдзень ад Кальцавой (зараз там зялёная зона, а на генеральным плане ўжо пазначаны жылыя дамы). Якой будзе сталіца, вырашыцца ўжо гэтай восенню.

Максім ПЛОТНІКАЎ.

ВАС ЦІКАВІЦЬ

Хто гэта і што гэта?

У мінулым нумары "Народнай Волі" была надрукавана заява Рады Усебеларускага кангрэса за незалежнасць. А мне цікава, хто ў яе ўваходзіць і што гэта за новае ўтварэнне – Усебеларускі кангрэс?

Сяргей ШЧЫПАКОЎ, *Мінск.*

У першым пасяджэнні Кангрэса ўдзельнічалі прыкладна 60–70 чалавек, але нейкай адзінай схемы абрання дэлегатаў не было. Ідэя склікаць Усебеларускі кангрэс належыць ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" і ініцыятыве "Рада беларускай інтэлігенцыі".

У Раду ўвайшлі 17 чалавек:

– Алена Анісім, каардынатар,
– Сяргей Антончык, дэпутат Вярхоўнага Савета 12-га склікання,
– Уладзімір Арлоў, пісьменнік,
– Святлана Багданкевіч, пісьменніца,
– Марат Гаравы, журналіст,
– Радзім Гарэцкі, акадэмік,
– Мечыслаў Грыб, былы старшыня Вярхоўнага Савета,
– Леанід Дзейка, былы дэпутат Вярхоўнага Савета,
– Антон Жылко, грамадскі актывіст,
– Рыгор Кастусёў, намеснік старшыні Партыі БНФ,
– Уладзімір Колас, кінарэжысёр, педагог, кіраўнік ініцыятывы "Рада беларускай інтэлігенцыі",
– Мікалай Курыльчык, старшыня Мінскай абласной арганізацыі ТБМ,
– Аляксей Марачкін, мастак,
– Аляксандр Мех, грамадскі актывіст,
– Міхаіл Пастухоў, былы суддзя Канстытуцыйнага суда,
– Станіслаў Суднік, пісьменнік, журналіст,
– Алег Трусаў, старшыня ГА "Таварыства беларускай мовы".

ЧУЛІ?

Віктар Ганчарэнка стаў галоўным трэнерам «Урала»

Беларускі трэнер Віктар Ганчарэнка стаў галоўным трэнерам "Урала". Ён падпісаў з екацерынбургскім клубам трохгадовы кантракт, паведамляе «Прессбол».

У сезоне 2014/2015 гадоў "Урал" заняў 13-е месца ў чэмпіянаце Расіі.

Віктару Ганчарэнку 37 гадоў. Ён набыў вядомасць, калі ў 2008–2013 гадах быў галоўным трэнерам барысаўскага БАТЭ. Менавіта Ганчарэнка ўпершыню вывеў беларускі футбольны клуб у групавы раўнд Лігі чэмпіёнаў.

Увосень 2013 года ён узначаліў расійскі клуб «Кубань». Але ў сярэдзіне лістапада 2014-га кіраўніцтва клуба скасавала кантракт з беларускім спецыялістам. З таго часу Ганчарэнка быў беспрацоўным.

УЧОРА

У крамах Мінска забаранілі начны продаж алкаголю

Продаж алкагольных і слабаалкагольных напояў, а таксама піва з учарашняга дня ў мінскіх крамах будзе ажыццяўляцца толькі з 9 да 22 гадзін.

Такое рашэнне прынялo ўпраўленне гандлю і паслуг Мінгарвыканкама. Падставай стала інфармацыя сталічнай міліцыі, што найбольш негатыўны ўплыў на крымінагенную сітуацыю ў Мінску аказвае начны продаж алкаголю ў крамах.

Праўда, гэтае абмежаванне не закране рэстараны, кавярні ды іншыя кропкі грамадскага харчавання.

ХРАНОГРАФ

Калі чакаць зборшчыкаў подпісаў?

Каляндар прэзідэнцкіх выбараў 2015 года

30 чэрвеня на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў павінен быць дадзены старт перадвыбарнай кампаніі. З вялікай доляй верагоднасці можна сказаць, што дэпутаты ўзгодняць дату выбараў, прапанаваную Цэнтральнай выбарчай камісіяй, – 11 кастрычніка.

Гэта значыць, што:

– да 17 ліпеня ўключна патэнцыяльным кандыдатам трэба будзе здаць дакументы на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы;

– з 23 ліпеня зарэгістраваныя ініцыятыўныя групы пачнуць збіраць подпісы за сваіх прэтэндэнтаў;

– да 21 жніўня штабы павінны здаць не менш за 100 тысяч подпісаў, каб зарэгістраваць кандыдата. Камісіі цягам 10 дзён праверацць як мінімум 20% подпісаў. Калі знойдзецца 15% несапраўдных, то будзе дадатковая праверка яшчэ 15% подпісаў. Калі пасля дзвюх праверак выявіцца, што сярод правераных подпісаў несапраўдных больш за 15%, то подпісы анулююць;

– 6–15 верасня пройдзе рэгістрацыя кандыдатаў. Калі спатрэбіцца, яе могуць працягнуць на 5 дзён. Да гэтай даты любая агітацыя забаронена. Можна толькі ставіць пікеты для збору подпісаў і збіраць подпісы па дамах. Члены ініцыятыўнай групы могуць паказваць і распавядаць інфармацыю пра кандыдата, але не маюць права пакідаць улёткі;

– з 17 верасня можна пачынаць агітацыйную кампанію. З гэтага часу дазволена распаўсюджваць рэкламу і ўлёткі, а кандыдаты пачнуць выступаць па радыё і тэлебачанні.

У дзень выбараў 11 кастрычніка агітаваць нельга. Але папярэдне размешчаныя плакаты могуць заставацца на вуліцах.

Калі ніводзін кандыдат не набярэ больш за 50 працэнтаў галасоў, то будзе другі тур. У ім возьмуць удзел два кандыдаты, якія набралі найбольш галасоў. Другі тур мусяць правесці не пазней за 25 кастрычніка.

Калі другога тура не будзе, то вынікі выбараў афіцыйна мусяць падвесці да 21 кастрычніка. Аднак вопыт падказвае, што ўсё будзе вядома яшчэ ўначы.

АСАБІСТАЯ СПРАВА

Анатоль Тозік пакуль адпачывае

Былы віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік займаецца грамадскай дзейнасцю і аб вяртанні на дзяржслужбу пакуль не думае. Пра гэта ён сказаў парталу TUT.BY.

Нагадаем, напрыканцы мінулага года Аляксандр Лукашэнка, абнаўляючы склад урада, у прыватнасці, адзначыў, што Анатоль Тозік вызвалены ад займаемай пасады ў сувязі з пераходам на іншую работу. Мы скарысталіся момантам і пацікавіліся ў экс-віцэ-прэм'ера магчымым новым відам дзейнасці. Тым больш што нядаўна прызначэнне атрымаў экс-мэр Мінска Мікалай Ладуцька, які на пару з Тозікам курыраваў у сталіцы рэалізацыю кітайска-беларускіх праектаў.

Анатоль Тозік нагадаў, што сышоў у адстаўку ў адпаведнасці з заканадаўствам у 66 гадоў. «Цяпер проста адпачываю», – сказаў былы высокапастаўлены чыноўнік. Ці збіраецца вяртацца на дзяржслужбу? «Што будзе далей – паглядзім. Жыццё пакажа», – адказаў ён, адмовіўшыся ад іншых каментарыяў.

Нягледзячы на адсутнасць партфеля, Анатолю Тозіку ёсць чым займацца. Па грамадскай лініі ў яго захаваліся два напрамкі работ. Ён узначальвае федэрацыю плавання і таварыства дружбы «Беларусь – Кітай». Пакуль гэтага цалкам хапае, сказаў Тозік.

АФІЦЫЙНА

Не браць у рукі зброю

У Беларусі прыняты Закон аб альтэрнатыўнай службе. Яго асноўныя палажэнні ўступаюць у сілу з 1 ліпеня 2016 года. Пра гэта паведамляе Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выбраць альтэрнатыўную службу змогуць тыя, хто не можа насіць зброю з-за рэлігійных перакананняў.

Яны будуць праходзіць службу ў арганізацыях аховы здароўя, сацыяльнай сферы, жыллёва-камунальнай, сельскай і лясной гаспадаркі, у арганізацыях, якія займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторый, будаўніцтвам і рамонтам дарог і чыгуначных шляхоў, пры ліквідацыі стыхійных і тэхнагенных бедстваў.

Для замены вайсковай службы на альтэрнатыўную трэба не пазней як за 10 дзён да канца прызыву звярнуцца з пісьмовай заявай у прызыўную камісію.

Гэта заява будзе разгледжана на пасяджэнні прызыўной камісіі ў прысутнасці заяўніка. Акрамя таго, на такое пасяджэнне могуць быць запрошаны «прадстаўнікі рэлігійных і іншых арганізацый, іншыя грамадзяне, якія могуць даць тлумачэнні па сутнасці заявы». Калі прызыўная камісія палічыць падставы дастатковымі, яна дазволіць прызыўніку прайсці альтэрнатыўную службу замест звычайнай.

Арганізацыю, у якой грамадзянін будзе праходзіць альтэрнатыўную службу, а таксама дату пачатку праходжання альтэрнатыўнай службы будзе вызначаць Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Асобы з вышэйшай адукацыяй будуць служыць 24 месяцы, без вышэйшай адукацыі – 36 месяцаў.

Альтэрнатыўнікам будуць плаціць 150% ад найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (памер БПМ на сёння складае 1.474.870 рублёў, таму "альтэрнатыўнік" будзе атрымліваць каля 2,1 мільёна). З 13-га месяца службы ўтрыманне павышаюць на 20% бюджэту пражачнага мінімуму, з 25-га месяца – на 40%.

Закон забараняе «альтэрнатыўнікам» браць удзел у забастоўках, займацца паралельна іншай аплатнай дзейнасцю ці працай, ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць.

Звальняюць з альтэрнатыўнай службы па хваробе (у выпадку прызнання непрыдатнымі да ваеннай службы ў мірны час) або ў выпадку пазбаўлення волі.

МЫ ПІСАЛІ

Памылачка выйшла...

Чыноўнікі Магілёўскага гарвыканкама схіляюцца да таго, каб выдаліць надпіс на пастаменце бюста расійскага паэта Аляксандра Пушкіна.

– Мы были и у травматолога, и у дерматолога. Причина не в этом. Хирург сказал, что нужно снимать ногти, но другой хирург прописал хлоргексидин и посоветовал подождать месяц, так как новые ногти могут тоже врастать. Мы пользуемся этим раствором, уменьшается краснота, ногти растут, правда, они не очень красивые. Посоветуйте, пожалуйста, что нам лучше делать?

– Необязательно полностью удалять ногтевые пластины. Можно выполнить малоинвазивную операцию – резекцию ногтевой пластины и удаление ростковой зоны ногтя с использованием радионожа или лазера. Пальчики после такого вмешательства заживают в течение 3–4 недель, и в дальнейшем рост ногтя в данной зоне не происходит. Детям эти операции тоже выполняются, малышам – под общим наркозом.

Мария ЭЙСМОНТ.

P.S. Вопросов от читателей на «Прямую линию» поступило очень много. Вероятно, дозвониться смогли не все желающие. Для тех, кто не задал свой вопрос, хорошая новость – осенью «Народная Воля» повторит «Прямую линию» с хирургом.



ВЕРНІСАЖ

Парыжскі салон у Мінску

Прызавы фонд арт-праекта "Восеньскі салон" складзе 25 тысяч еўра.

Для адных Францыя асацыіруецца з Эйфелевай вежай, для другіх – з мелодыямі "Шэрбургскіх парасонаў", для трэціх – з героямі Бальзака або Дзюма. А вось прафесійныя мастакі з усяго свету з зайздрасцю згадваюць Парыжскі салон. Заснаваны каралём Людовікам XIV у 1667 годзе, ён стаў адной з самых прэстыжных мастацкіх выставак Францыі. Поспех мастака на парыжскіх салонах гарантаваў яму вядомасць і прызнанне. Пазней ад афіцыйнай выстаўкі адасобіліся некалькі незалежных салонаў. Сярод іх Восеньскі салон, дзе можна было ўбачыць карціны **Поля Сезана, Агюста Рэнуара** і **Анры Мацiса.** Цяпер гэты брэнд узяў на ўзбраенне "Белгазпрамбанк", які з нагоды ўласнага 25-годдзя заснаваў арт-праект "Восеньскі салон". Яго мэта – узнавіць атмасферу парыжскіх салонаў на глебе беларускага мастацтва. Як гэтага дасягнуць? Да 10 ліпеня будзе праходзіць адборачны тур. Кожны беларускі мастак ад 18 да 40 гадоў можа прапанаваць тры свае працы, створаныя ў любым жанры і відзе мастацтва (прымаюцца працы, створаныя за апошнія тры гады).

Адбор мастакоў ажыццяўляе прафесійнае журы з 9 беларускіх экспертаў (іх імёны арганізатары пакуль не агучваюць). Творцы, якія пройдуць адбор, выставяць свае творы ў сталічным Палацы мастацтва. Іх зможа ўбачыць кожны жадаючы з 8 кастрычніка да 8 лістапада гэтага года.

Да выставы выдадуць каталог з працамі ўсіх удзельнікаў, які разашлюць у вядучыя сусветныя арт-цэнтры. Галоўнае, што ўсе мастакі стануць суіскальнікамі прэміі «Арт-Беларусь» (прызавы фонд 25 тысяч еўра), якую заснаваў "Белгазпрамбанк". Пераможца ў намінацыі «Вялікі прыз» атрымае **15 тысяч еўра**, у намінацыі «Малы прыз» – **7 тысяч еўра**. Апроч таго, існуе «Прыз глядацкіх сімпатый», які будзе прысуджаны паводле вынікаў галасавання наведвальнікаў выставы і on-line галасавання. Яго памер – **3 тысячы еўра**. Творцаў, якія атрымаюць гэтыя ўзнагароды, будзе выбіраць ужо іншае, міжнароднае, журы.

Кожны з удзельнікаў арт-праекта павінен выставіць кошт за сваю працу. Калі ў яе знойдзецца пакупнік, карціна пяройдзе ў яго ўласнасць.

ДАРЭЧЫ

Падтрымаць сучаснае беларускае мастацтва вырашыў і **"Альфа-Банк".** *Пры яго фінансавым спрыянні 18 чэрвеня на востраве Камсамольцаў, што знаходзіцца ў акваторыі сталічнага Камсамольскага возера, адкрыецца праект "Арт-астравы". 11 беларускіх мастакоў (сярод іх* **Канстанцін Селіханаў, Міхаіл Шыкаў, Канстанцін Касцючэнка, Павел Вайніцкі** *і іншыя) створаць экспазіцыю з шматметровых авангардных прасторавых аб'ектаў. Агульная вага экспанатаў перавышае 20 тон! Як адзначыла дырэктар дэпартамента маркетынгу "Альфа-Банка"* **Кацярына Краўцова**, *арт-праекты такога маштабу раней у Беларусі не ствараліся, хоць яны шырока распаўсюджаны ў еўрапейскіх сталіцах". Чакаецца, што на працягу лета экспазіцыю наведае не менш за мільён гледачоў. Уваход бясплатны!*

Максім ПЛОТНІКАЎ.

ФАКТ

Беспрацоўе як рэальнасць

Тры чалавекі на адно вакантнае працоўнае месца – такі вынік эканамічнай стагнацыі за апошнія пяць месяцаў у Брэсце.

У мясцовым Цэнтры занятасці толькі за апошнія пяць месяцаў, згодна з афіцыйнай статыстыкай, колькасць працоўных месцаў скарацілася на 60 працэнтаў.

ТРАГЕДЫЯ

Вясковыя жарсці

У Бялыніцкім раёне ў доме згарэлі двое – мужчына і жанчына. У 60-гадовай пенсіянеркі загарэўся дом, дзе яна знаходзілася з 45-гадовым аднавяскоўцам. Падазроная ў падпале – сужыцелька мужчыны. Магчымая прычына – рэўнасць.

Першапачаткова яе дзеянні кваліфікаваны як двайное забойства. Пра гэта паведамляе прадстаўнік Следчага камітэта Аксана Салянюк.

Калі віна раўнівай жыхаркі Бялыніцкага раёна будзе даказана, ёй пагражае да 25 гадоў зняволення ці пажыццёвае зняволенне.

СІТУАЦЫЯ

Удава кампазітара Ігара Паліводы забараняе выконваць яго песні

Адкрываць XV Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне планавалі песняй Ігара Паліводы на верш Леаніда Пранчака «Маладзечна». Аўтары напісалі яе ў 1993 годзе, і на працягу многіх гадоў песня выконвалася на фестывалі салістамі Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Але вось ужо другі год запар гэтая песня на фестывалі не гучыць...

«Ведаючы аб леташніх канфліктах з удавой кампазітара, мы вялі з ёй перамовы. Яны былі доўгімі і знясільваючымі. Вольга Палівода вылучала непад'ёмныя фінансавыя патрабаванні да тэлеканала СТБ, які вёў запіс канцэрта, а арганізатарам фестывалю з Маладзечна прапаноўвала аказаць ёй спонсарскую дапамогу ў выглядзе прадукцыі аднаго з прадпрыемстваў горада», – распавяла рэдактар канцэрта-адкрыцця **Людміла Палкоўнікава.**

Паводле яе слоў, арганізатары пайшлі на максімальныя саступкі: *«Пачаліся рэпетыцыі песні, яе вывучылі зоркі нашай эстрады і пераможцы конкурсу маладых выканаўцаў розных гадоў. Арганізатары з Маладзечна падзяліліся з жыхарамі горада радаснай весткай аб тым, што песня зноў загучыць, і ў сваіх інтэрв'ю аб праграмах фестывалю асабліва падкрэслівалі гэта, называючы імя Ігара Паліводы. Але ўдава перадумала і зноў забараніла выкарыстанне песні. Зноўку пачалі перамовы і зноў дасягнулі пагаднення. Гэтыя гульні паўтараліся, і, бачачы, што са сваім словам удава вельмі вольна абыходзіцца, кіраўніцтва тэлеканала прасіла аформіць пісьмовы дазвол».*

«З яго падпісаннем Вольга Палівода цягнула да апошняга моманту. У выніку прыехала ў Маладзечна і менш чым за гадзіну да пачатку канцэрта вусна забараніла выкарыстоўваць песню, – працягвае тлумачыць сітуацыю Людміла Палкоўнікова. – *Каб пазбегнуць далейшых скандалаў, нам давялося тэрмінова перакройваць праграму, выпраўляць тэксты вядучых. Але справа не ў гэтых складанасцях. Перш за ўсё пацярпела публіка, жыхары Маладзечна, якія хацелі пачуць песню пра свой горад".*

Аксана ЯНОЎСКАЯ, "Беларускія навіны".

ПЕРСОНА



Живописец

Досье «Народной Воли»

Владимир Антонович Товстик родился в Минске, в семье военнослужащего. С 1966-го по 1972 год учился в Белорусском театрально-художественном институте. Затем три года – в Творческих мастерских Академии художеств СССР. С 1978 года преподает в Академии искусств Беларуси.

В 1994 году ему присуждена Государственная премия Республики Беларусь за серию живописных работ «Свет и тени». В 2011 году присвоено почетное звание «Народный художник Беларуси» и ученое звание «профессор» по специальности «Искусство».

Работы Владимира Товстика находятся в Национальном художественном музее, Музее современного изобразительного искусства, коллекции Союза художников, Бакинском художественном музее им.Мустафаева, в коллекциях Министерства культуры Беларуси и России, в галерее «Питер Брейгель» (Голландия), галерее «Марка Датрина» (Италия), Музее русского искусства (Нью-Джерси), Zimmerli Art Museum (США), а также в частных собраниях Финляндии, Германии, Словении, Швейцарии, Греции, Израиля, Польши, Беларуси и России.

25 вопросов профессору Академии искусств, который считает, что закупки картин Минкультом должны быть не келейными, а прозрачными – иначе это общественное событие обесценивается.

Хорошо пить чай с мармеладом в мастерской народного художника! ***Владимир Антонович ТОВСТИК*** *поставил на стол фарфоровые чашки «мадонна» – жена художника списала их из домашнего обихода как устаревшие. Посуда – да, она всего лишь утварь, ей по «статусу» положено быть в тренде. А почему устаревают картины? Да и устаревают ли? Почему мы так болезненно воспринимаем произведения на совсем недавние исторические сюжеты? Вот про моду в искусстве мы и говорили с профессором Товстиком. Хотя официальный повод тоже был – 70-летие одного из старейших вузов страны, Академии искусств Беларуси, где Владимир Антонович много лет заведует кафедрой рисунка.*

1. **– Шла к вам на интервью мимо здания Академии искусств. А оно еще все на ремонте… Сколько же он длится? Наверное, неудобства уже, как говорится, вынули душу?**

– Академия сейчас раскинута по городу в пяти или даже в шести местах: театральный факультет в одном месте, художественный – в другом, дизайн – в третьем... За четыре года целое поколение студентов выучилось, не зная родных стен. Это плохо, потому что действует морально.

2. **– Сколько лет вы работаете в академии, Владимир Антонович?**

– Почти всю жизнь. В следующем году будет 40 лет. Никогда не менял место работы.

3. **– Вы сами заканчивали это учебное заведение. Что сегодня профессор Товстик поставил бы студенту Товстику?**

– Студент Товстик, признаюсь, хвостов не имел. Но в то время, когда учились мы, была более чистая, что ли, жажда знаний. Очень ценилось мастерство. Иногда мы приходили рисовать утром, а уходили поздно вечером, а может, и совсем не уходили – это если перед просмотром. Да, были, конечно, строгие рамки соцреализма. Ну и сейчас есть рамки – масскультуры, актуального искусства. Но ведь самые непреодолимые рамки и штампы, согласитесь, человек создает себе сам. А трудности, они есть во все времена. Абсолютно. Вот смотрите. Нам теперь кажется, что Возрождение – это идеальная эпоха в истории человечества. Но ведь это было жестокое время! На самом деле жизнь не стоила и копейки, тебя могли пырнуть ножом за любым углом. Хотя искусство того времени – возвышенное, человека делали богоподобным...

4. **– И о чем это говорит?**

– Что искусство и жизнь не одно и то же.

5. **– Тогда осмелюсь спросить, профессор, что же такое искусство, по-вашему?**

– Вроде бы вещь бесполезная. Висит картина на стене – она есть, но в то же время ее как бы и нет. Тем не менее действует! Все: картина, икона, мозаика, скульптура несет энергетику ее создателя. Понимает зритель или не понимает произведение искусства – оно действует на него! Даже если он проходит мимо, все равно действует. Хотя признаю: сегодня мир движется в сторону супермаркетов. Приготовил – съел – забыл. Ценность рукотворной вещи теряется.

6. **– Говорят, что неудачи закаляют, что они нужны таланту больше, чем успех. Какие трудности закалили ваш характер?**

– У каждого художника одна-единственная трудность на всю жизнь: написать хорошую картину. Хотя у нашей белорусской публики есть такая особенность: далёкае лепш за сваё, блізкае. Перед далеким мастером можно даже преклоняться. Я поражаюсь, как можно восхищаться приезжим художником Никасом Сафроновым, когда дома есть живописцы в 20 раз лучше него.

7. **– Оценка Запада для многих творческих людей очень важна. Например, который год Беларусь штурмует Венецианское биеннале, чтобы хоть боком засветиться в актуальном искусстве. Вы считаете напрасно?**

– Актуальное искусство… А что привезла туда Беларусь в этом году? Архивный проект, фото Первой мировой войны – просто подача материала с использованием современных технологий. А Владимир Кожух в это же время дома, в Минске, выставляет картины, традиционную живопись, но на тему украинских событий. Так кто актуальнее? Ответа нет! В искусстве не бывает: раз новомодное – значит, лучшее. «Или – или» – в искусстве это неправильно. Нельзя сказать, что одно лучше другого. Да, современному актуальному искусству надо учить, открывать новые факультеты. А у нас как? Съездили в Европу, смастерили такое же. Ай, как хорошо! А оно не хорошо, потому что одинаково. Теперь новый свет в окошке – Болонский процесс, идея унификации образования. Да, национальной науки нет. А вот искусство – есть! Искусство может быть только национальное.

8. **– У вас есть интересный факт в биографии. После Академии искусств в Минске (тогда – Театрально-художественный институт) вы поехали учиться в Творческие мастерские Академии искусств СССР. Вас направили в Баку. Это было важно для вашего становления?**

– Творческие мастерские – это стажировка при большом мастере, своего рода художественная аспирантура. Эскизы твоей дипломной работы утверждались самим Президиумом Академии художеств СССР. И принимал работу тоже он, Президиум. То есть лучшие художники страны. Мой педагог Натан Моисеевич Воронов, сам выпускник Академического института имени Репина, настоял на таком продолжении образования. Мы послали мои документы в Москву. Конечно, парня из Беларуси никто не ждал ни в Москве, ни в Ленинграде. Но в Баку тоже открылись Творческие мастерские, и народный художник СССР Микаил Гусейнович Абдуллаев, действительный член Академии художеств, набирал себе азербайджанских ребят. Кого-то из них не утвердили, освободилось место. Он согласился взять меня.

9. **– Это ведь здорово – поработать с другим мастером, в другой республике, такой непохожей на родину, правда?**

– Это здорово, потому что Баку – это Восток. Другая культура, другой темперамент. Мы сравнивали, кто что может. Мы обогащались! Это было очень интересно и помогало творческому становлению. Поэтому я не понимаю, как один из выпускников белорусских Творческих мастерских, которые когда-то создавали Михаил Андреевич Савицкий и Георгий Георгиевич Поплавский, лично поспособствовал тому, чтобы закрыть и переформатировать их в площадку для современного искусства. Конечно, такому искусству тоже надо давать помещение. Но не за счет академического образования!

10. **– Окончательное решение тогда принимал министр культуры Павел Латушко. Считаете, что это было ошибкой? Правда, министры культуры у нас так часто меняются, что не успевают ответить за свои решения.**

– По-моему, закрытие мастерских – волюнтаристский шаг. А теперь попробуй их возроди! Во всем мире центры современного искусства открываются на старых заводах, а не на прославленных академических площадках.

11. **– Но я хочу спросить опять о Баку, вернее, более глобально – о дружбе народов. Сейчас она дала огромную трещину. Как вы думаете, все неисправимо или есть надежда на будущее?**

– Стравить людей очень просто. Хотя обычные граждане, они ведь никогда и не ссорились. Я сколько раз был в Киеве – прекрасный город, интересное искусство и художники. Жаль, что государства, достигая определенной силы, начинают толкаться локтями. Но это, наверное, закон природы. Хотя я, к счастью, имею возможность не заниматься политикой. Это другой вид человеческой деятельности. Мне ближе искусство.

12. **– Оно сейчас как раз очень политизированное. Европа буквально заставляет художника иметь четкую политическую позицию. Иначе его просто не покупают! Это правильно, как вы считаете?**

– Кроме Европы есть еще Азия. И такая большая страна, как Китай, которая очень ценит советскую школу изобразительного искусства. А мы все смотрим в Европу... Однако в Азии совсем другая тенденция: и общественная, и эстетическая. Там очень ценится фигуративная живопись. Хотя Китай большой, два миллиарда жителей, там все есть. Но любимый русский художник в Китае знаете кто?

– Попробую угадать. Репин?.. Левитан?..

– Левитан! И все делают его копии.

13. **– Лучших выпускников Академии художеств в XIX веке в России для продолжения образования посылали в Италию, советских – по союзным республикам (как, например, вас – в Баку). А что предлагает сейчас государство белорусским выпускникам Академии искусств? Куда вы посылаете их для огранки таланта? Предлагаете бесплатный поход в Ботанический сад?**

– Нет, зачем же так... Отделение художников театра и кино ездило, например, в Прагу на пленэр и выставки. Но, конечно, экономически тяжело. Куда мы посылаем студентов? Во-первых, кто нам может помочь послать? Или спонсоры, или родное министерство. Наши белорусские студенты академии, к слову, пару лет получали премии фонда Марии Шараповой. А студенты с актерского факультета – премии фонда Олега Табакова. Но это единичные случаи, разовые акции. Таких фондов и премий должны быть десятки. Приняли бы более либеральный закон о меценатстве, глядишь, банки бы и повернулись к академии лицом.

14. **– А вот если зарплату педагогам академии увеличить в 10 раз – это, как вы считаете, скажется на учебном процессе?**

– Просто поднять? Нет. Надо найти паритеты и балансы для всего изобразительного искусства страны.

15. **– И что ему, нашему национальному искусству, необходимо сейчас позарез?**

– На мой взгляд, нам сейчас не хватает открытой конкурентности. Есть в Министерстве культуры фонд по закупке произведений искусства. Но работает он не прозрачно. Почему? Наверное, потому, что маленький, средств не хватает. Фонд делает закупки, но экспертная комиссия (авторитетные люди) результаты закупок не афиширует. Это неправильно! При всей скромности финансовых средств картины надо покупать открыто, после больших выставок (пусть раз в год или даже раз в два года), когда работы посмотрела публика, критики, коллеги-художники. Для чего? Чтобы к вернисажам серьезно готовились, чтобы художники делали большие работы. А келейно, хоть и справедливо, раздавать деньги – это не то, не то. Не тот общественный резонанс, если никто не знает, что и у кого купило Министерство культуры. Обесценивание удач. Нужна прозрачная закупка, чтобы отбиралось лучшее и характерное для времени.

16. **– Как вы считаете, слово "интеллигенция" еще что-то значит в нашем обществе?**

– Что тут считать? Единицы остались... Но сама природа человека состоит в том, чтобы самореализоваться. Максимально состояться. В любой области. Это неистребимо. А интеллигент – он прежде всего профессионал. Вот спрашивают: есть еще талантливые студенты? Они всегда будут. Желание видеть, чувствовать и изобразить будет всегда в той или иной форме.

17. **– Скажите, Владимир Антонович, вы не писали картину для президентского дворца?**

– Вам скажи, Елена Владимировна... Мы писали. Но нам сказали, что живопись дворцу не нужна, что у него, как у государственного здания, другая функция. Для интерьера взяли несколько сюжетных картин моих товарищей в зал переговоров. Но вообще-то это не совсем правильно. В официальных местах должны быть на виду национальные произведения искусства, отображающие прежде всего историю государства. Вот, скажем, открываются сейчас после реставрации замки. У них что, своей истории нет? Есть, и какая! Но почему тогда считается, что лучше купить задрипанный ковер на аукционе, который не имеет никакого отношения к историческому месту, а не заказать картину, исторический холст художнику? Или вот вопрос: почему до сих пор не нашел своего места в стране «Гобелен века» народного художника Александра Кищенко? Это неправильно, что он забыт. Пусть некоторые политические деятели кому-то нравятся, кому-то не нравятся, но это талантливый труд художника. А фигура Кищенко сейчас актуализируется. Вышла монография о его творчестве. И поверьте мне: чем дальше, тем больше будет внимания ему и его поколению.

18. **– А где теперь лежат гобелены Кищенко из Большого театра, которые висели там до ремонта? Куда они исчезли? Надеюсь, на коврики не порезали?**

– Я тоже надеюсь. У нас, к сожалению, это общая судьба монументального искусства. Люди создают произведения искусства, потом приходит время ремонта или новых политиков, и все идет прахом. Вспомним тот же гобелен «Ленинизм», который висел в ЦК при советской власти. Это гениальное произведение Савицкого и Кищенко! На сегодняшний день на западном рынке его можно было бы продать за большие деньги. Произведение – эпоха. На искусство надо смотреть без политики, без накрученности. Смотрит же сейчас Франция на картины про коронацию Наполеона – а куда от истории деться?

19. **– Вы часто писали портреты официальных лиц?**

– Приходилось. И что в этом плохого? Есть портрет камерный, а есть – официальный. Был ли, например, Веласкес сервильным художником? Да, он всю жизнь прожил около короля. Но сервильным художником не был по той простой причине, что глубина гения Веласкеса в том и состояла, что к королю он относился как к человеку. Он не надувал его личность на портретах, а по-человечески глубоко чувствовал его и положительные, и отрицательные качества.

20. **– Официальные лица щедро расплачиваются за работу? Или просят ее как подарок?**

– Во-первых, заказывали мне не лица, а организации. Во-вторых, они и расплачивались по госрасценкам.

21. **– А кто у нас сегодня продает свои работы дороже всех?**

– Я чужих денег не считаю. И потом: где она, цена, официально звучит? Человек сам ее называет? Или цена зафиксирована на аукционе «Сотбис»? Чувствуете разницу? Но сейчас время самопиара, многие сами говорят о себе – «мировой уровень»...

22. **– Ваша мастерская находится почти дверь в дверь с мастерской Леонида Дмитриевича Щемелева, патриарха белорусского изобразительного искусства. Что вам больше всего импонирует в этом особенном человеке?**

– Он для меня пример отношения к искусству и к жизни. Незлобивый, независтливый. Не кичащийся достижениями. Умный, талантливый. Классик, одним словом.

23. **– Владимир Антонович, можно спросить, почему вы не водите автомобиль?**

– А не люблю. И никогда не было тяги. А вот у дочек машины есть, девочки водят.

24. **– Знаю, что одна ваша дочка вышла замуж за поляка и живет в Кракове. И что, ее материальное положение лучше, чем у той, что живет в Минске?**

– Мне кажется, нет. Моя умная жена определила обеим девочкам в свое время хорошие профессии, так что не бедствует ни одна, ни вторая. Минчанка – классный стоматолог. «Полька» – полиграфист, делает макеты, верстки.

25. **– А вот дети «польки» – ваши внуки – на каком языке говорят?**

– И по-русски, и по-белорусски, и по-польски могут. Да и я два дня в Польше побуду – и уже на «ламанай пальшчызне» могу разговаривать.

Елена МОЛОЧКО.

КАШАЛЁК

Паклапаціліся пра людзей ці пра банкі?

Гэтым летам турыстычныя пуцёўкі падаражэлі на 3–5 працэнтаў. Пра гэта паведаміў дырэктар дэпартамента па турызме Мінспорту Беларусі **Вадзім Кармазін.**

Паводле яго слоў, на падаражанне паўплываў пераход на разлікі ў нацыянальнай валюце.

Нагадаем, што раней за турыстычныя пуцёўкі можна было разлічыцца валютай. Цяпер – толькі беларускімі рублямі, а ўжо потым турфірмы самі набываюць валюту, каб разлічыцца з замежнымі гатэлямі. Натуральна, што розніца паміж курсамі продажу і пакупкі валюты адбілася на кошце пуцёвак. А хто ад гэтага выйграў? Толькі банкі.

Алена НОВІКАВА.



АСАБІСТАЕ ЖЫЦЦЁ

У Пінску высветлілі, у якой царкве браў шлюб Якуб Колас

У Пінску ўжо дакладна ведаюць, у якой царкве браў шлюб класік беларускай літаратуры Якуб Колас.

Як вядома, "бацька" сучаснай беларускай літаратуры ажаніўся з настаўніцай Марыяй Каменскай у горадзе над Пінай у чэрвені 1913 года. Тут жа праз год нарадзіўся першы сын Даніла.

Доўгі час былі спрэчкі аб тым, у якой царкве браў шлюб Колас, і частка краязнаўцаў лічыла, што той святыні ўжо няма. Але храм захаваўся. Свята-Варварынская царква дзейнічае дагэтуль і вельмі шануецца праваслаўнымі.

Мясцовыя ўлады ўжо прапанавалі ўвекавечыць факт шлюбу Коласа ў Пінску праз усталяванне на царкве альбо на яе тэрыторыі шыльды. Ініцыятыва ўзгадняецца з Мінскам.

Народная Воля http://www.nv-online.info 16 ЧЭРВЕНЯ 2015 г.

ШАХМАТЫ

Родившийся в День шахмат

«Народная Воля» выражает признательность ведущему шахматного отдела **Абраму Яковлевичу Ройзману** *за многолетнее сотрудничество.*



Абрам Яковлевич – один из старейших шахматистов Беларуси, признанный мастер древней игры, внесший неоценимый вклад в популяризацию и развитие этого вида спорта в стране. И на девятом десятке лет он сохранил молодой творческий задор и спортивный азарт. Ройзман принял участие почти в двух с половиной десятках чемпионатов республики, в 1966 году был чемпионом БССР, в первенстве 1973 года разделил 1–4-е места. Международный мастер и международный арбитр, Абрам Ройзман известен не только как организатор и судья многочисленных турниров, но и как автор нескольких книг и многочисленных статей по шахматам. Не случайно же Абрам Яковлевич родился 20 июля – в Международный день шахмат.


Предлагаем любителям шахмат одну из партий старейшего белорусского мастера.

Ройзман–Оноприенко (Минск, 1967). 1.c4 Kf6 2.Kc3 g6 3.g3 Cg7 4.Cg2 d6 5.e4 0-0 6.Ke2 e5?! 7.0-0 Ce6 8.d3 Фc8 9.f4 c6 10.f5! gf 11.Cg5 f4 12.gf ef 13.K:f4 Kbd7 14.Фel Ke5 15.Фh4 Kfg4 16.K:e6 Ф:e6 17.h3 Kh6 18.Ke2! K:d3 19.Лf6! Фe5 20.Лafl! Фc5+ 21.Kph1 Ke5 22.Л:h6 Kg6 23.Фh5 C:h6 24.Ф:h6 f5 25.Kg3 f4 26.Kh5 Лf7 27.Kf6+, черные сдались.

Новый ведущий

Теперь раздел «Шахматы» будет вести **Вадим Жилко**, журналист и литератор, редактор шахматного бюллетеня «Альбино», автор около 180 опубликованных шахматных задач. Все лучшие традиции раздела будут сохранены. Вадим Жилко приглашает читателей принять участие в оптимизации работы раздела: присылайте свои предложения, замечания, интересную информацию как на почтовый адрес «Народной Воли» (220030, г.Минск, ул.Энгельса, 34а, «Шахматы»), так и на электронный адрес: vadim_ne67@mail.ru

Матч городов-героев



Это состязание шахматных композиторов Беларуси и России проводилось в седьмой раз (к сожалению, без участия специалистов из Украины) и завершилось накануне 70-летия Победы. Из восьми команд призовую тройку составили участники из Московской области, Санкт-Петербурга и Тулы. Москва заняла 4-е место, Брест – 5-е, далее расположились Волгоград, Мурманск и Минск. Всего на суд арбитров было представлено 77 композиций в шести разделах от 40 авторов. В разделе трехходовок первое место заняла задача Николая Быкова (Барановичский район), выступавшего за команду Бреста, что допускалось правилами *(см. диаграмму)*.

Белые: Kpg8, Фa8, Лf3, Cf6, Cg6, Ka3, Ke1, пп.c5, d5, e2, f5, g5, h3 (13).

Черные: Kpe4, Лb5, Лd4, Kb1, Kc3, пп.a6, b6, d6, d7, f4 (10).

Мат в 3 хода.

Предлагаем читателям решить задачу самостоятельно.

Многоходовка брестчанина Александра Варицкого разделила третье место. В команду Бреста входил также известный этюдист из г.Ганцевичи Иван Бондарь. Команду Минска составляли Владимир Сычов (капитан), Владимир Бартош, Николай Бельчиков, Виктор Быков, Михаил Кошель и Чеслав Якубовский.

Турнир за турниром...

16-й чемпионат Европы среди женщин, проходивший в Грузии при 98 участницах, выиграла украинка Наталья Жукова. Белоруска Анастасия Зезюлькина – на 24-м месте с 6 очками из 11, а Ланита Стецко, проигравшая в последнем туре соотечественнице, – на 47-м (5,5 очка).

Никита Майоров выиграл турнир в Италии (51 участник), набрав 7 очков из 9. Сергей Азаров в Чикаго при 113 участниках разделил 2–5-е места со знаменитым Гатой Камским – 6,5 из 9, а Алексей Александров в Индии (140 участников) разделил 2–4-е места – 7,5 из 10. Валерий Казаковский финишировал на 5–6-м местах на турнире «Юные звезды мира» в г.Кириши – 6,5 из 11, а 15-летний минчанин Михаил Никитенко успешно состязался с гроссмейстерами на Кубке Р.Нежметдинова в Казани – 19-е место при 94 участниках.

НОВЫЯ ІМЁНЫ

Дзмітрый НАБОКАЎ:

«Ахвяры былі недарэмныя...»

У сваe 19 гадоў магілёўскі лёгкаатлет Дзмітрый НАБОКАЎ мае чым пахваліцца. ...Хлопец быў адзіным з беларусаў, хто прывёз медаль з мінулагодняга чэмпіянату свету сярод юніёраў – стаў другім у скачках у вышыню. А ў бягучым годзе яго ўзнагародзілі айчыннай прэміяй "Атлетыка" як лепшага спартсмена ў сваёй узроставай катэгорыі. Дзмітрый распавёў "Народнай Волі", як прыйшоў у спорт, за што на яго сварыліся бацькі і чаму ён не любіць сваю лёгкаатлетычную дысцыпліну...



Даведка "Народнай Волі"

Дзмітрый НАБОКАЎ

Нарадзіўся 20 студзеня 1996 года ў Бялынічах. Майстар спорту міжнароднага класу. Трэнер – Уладзімір Алейнік. Лепшае дасягненне – сярэбраны прызёр юніёрскага чэмпіянату свету-2014 (Юджын, ЗША). Персанальны рэкорд у скачках у вышыню – 2,24 метра.

– Я нарадзіўся ў Бялынічах, – *пачынае расказваць Дзмітрый*. – Мае бацькі – простыя людзі, якія ніякага дачынення да спорту не маюць. Мама працуе настаўніцай рускай мовы, можа, таму гэты прадмет у мяне і быў адным з самых любімых у школе. (*Усміхаецца.* – **Аўт.**) Тата – будаўнік. Бацькі, дарэчы, не штурхалі мяне ў бок спорту, у гэтым плане я ўсё вырашаў сам.

– Метадам спроб і памылак?

– Можна і так сказаць. З дзяцінства быў рухавым хлопцам, любіў пабегаць па вуліцы. Мала чым адрозніваўся ад іншых. Але, як бывае ў дзяцінстве, – хацелася паспрабаваць некалькі відаў спорту. Спачатку займаўся баскетболам, потым хадзіў у секцыю дзюдо. Побач трэніраваліся лёгкаатлеты, захацелася і мне такога ж. Уласна кажучы, так і апынуўся ў секцыі лёгкай атлетыкі. Праўда, праз некаторы час сышоў адтуль праз канфлікт з аднагодкамі. Натуральна, гэта была такая дзіцячая крыўда, але мне здавалася, што на "каралеве спорту" стаўлю крыж.

– Чаму вырашылі вярнуцца?

– Перабалела, ды і не мог без спорту. Праз год вырашыў даказаць сабе, што чагосьці варты, і працягнуў займацца. Спачатку, праўда, не скачкамі ў вышыню. Не ведаю, ці здагадваюцца пра гэта мае трэнеры, але прызнаюся шчыра: скачкі ў вышыню вельмі не любіў. Скакаў у даўжыню, думаў, што так будзе і далей. Але пазней усё ж такі змяніў дысцыпліну. Трэнеры дапамаглі. А з часам я і на самай справе пачаў паказваць у скачках у вышыню вынікі лепшыя, чым былі ў маіх аднагодак. Зараз ні аб чым не шкадую. Атрымалася тое, што атрымалася.

– Дзякуючы сваім вынікам вы трапілі пад увагу Уладзіміра Алейніка – трэнера, які, па сутнасці, даў вам пуцёўку ў вялікі спорт.

– Так. Магу сказаць, што мне пашчасціла з трэнерам. Уладзімір Міхайлавіч – сапраўдны прафесіянал, чалавек, які вельмі любіць лёгкую атлетыку. Ці строгі? Не. Патрабавальны – гэта пра яго, але не строгі. Ніколі не крычыць, не нервуецца. Наадварот – ставіцца да кожнага спартсмена як да роднага і заўжды за нас перажывае. Менавіта пад яго кіраўніцтвам я і атрымаў найвышэйшае дасягненне ў сваёй спартыўнай кар'еры – стаў сярэбраным прызёрам на мінулагоднім юніёрскім чэмпіянаце свету ў ЗША.

– Верылі, што ў Амерыцы будзе медаль?

– У спорце можа здарыцца ўсялякае. А што да тых спаборніцтваў, то яны дагэтуль застаюцца самым яркім успамінам у кар'еры. У фінал спаборніцтваў мы выйшлі з сябрам па камандзе Андрэем Скабейкам. Менавіта ён і лічыўся галоўным фаварытам. Але ў яго, на жаль, не склалася. Не скажу, што і ў мяне было ўсё гладка. Вышыню ў два метры і дзесяць сантыметраў я пераадолеў толькі з трэцяй спробы. Тая самая гісторыя паўтарылася і ў другім падыходзе. Пакарылася вышыня 2,22 метра. Але і гэтага было мала для таго, каб трапіць на п'едэстал. Прыйшлося ставіць асабісты рэкорд: 2,24 метра.

– Па вяртанні на радзіму вам неяк аддзячылі?

– Пасля заваявання медаля на чэмпіянаце свету я стаў стыпендыятам Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Зараз атрымліваю добрыя грошы, дапамагаю бацькам. Яны задаволены, хоць у свой час тата і "піліў" за тое, што з-за майго захаплення спортам падае паспяховасць у школе. Час паказаў, што ахвяры былі недарэмныя.

Акрамя стыпендыі ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба ў мяне зараз ёсць прафесійны кантракт з нацыянальнай зборнай краіны тэрмінам на год. Далей усё будзе залежаць ад вынікаў.

– Акрамя таго, вы сталі ўладальнікам першай айчыннай прэміі "Атлетыка".

– Прыемна, безумоўна, але, спадзяюся, гэта толькі прыступка на шляху да вяршыні, якую хачу ўзяць у вялікім спорце...

– Медаль Алімпіяды?

– А чаму б і не? Хачу патрапіць на Алімпійскія гульні, адчуць атмасферу гэтых спаборніцтваў. Але да гэтага яшчэ працаваць і працаваць. Зараз вось б'юся над тым, каб палепшыць асабістае дасягненне. Пакуль не атрымліваецца.

– Ёсць у каго павучыцца?

– Натуральна, ёсць! У свой час на ўвесь свет грымела прозвішча кубінца Хаўера Сатамаёра, зараз цудоўна выступае катарац Мураз Баршым... Але лёгкая атлетыка – не матэматыка, дзе ў большасці выпадкаў ёсць адно правільнае рашэнне. Кожны спартсмен – індывідуальнасць, са сваёй тэхнікай і асаблівасцямі. У любым выпадку – мне ёсць куды расці.

– Вольны час па-за спортам застаецца?

– Так, на навучанне. Зараз я вучуся ў Магілёўскім вучылішчы алімпійскага рэзерву, хутка сесія. Да таго ж трэніроўкі ніхто не адмяняў. Вучылішча павінен скончыць у наступным годзе, а далей, напэўна, буду паступаць ва Універсітэт фізкультуры. А ў вольны час... Калі для многіх адарвацца ад камп'ютара і пайсці ў спортзал праблема, то мая праблема ў іншым – не хапае часу, каб дарвацца да інтэрнэту. А бывае, што так гэтага хочацца! Не скажу, што я фанат камп'ютарных гульняў, але здараецца, што лепшы адпачынак – менавіта такі.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

КАДРЫ

Иван ИВАНКОВ:

«Думаю, я заслужил немного уважения»

Известный белорусский гимнаст Иван Иванков может возглавить сборную Беларуси по спортивной гимнастике.

После завершения спортивной карьеры белорусский гимнаст Иван Иванков уехал «покорять Америку». Перед отъездом он с обидой рассказывал «Народной Воле», почему оказался не нужен на Родине:

«Белорусские тренеры уезжали и уезжают за границу в основном из-за быта и финансового положения. Это серьезная проблема, но давайте посмотрим на нее с другой стороны. За мою спортивную карьеру меня растила Москва, затем в меня вкладывало деньги родное государство. Вот он я, подготовленный специалист. Не надо искать за рубежом. А сколько мы потеряли хороших преподавателей! Не сумели сохранить, не сумели вовремя понять, чем людей можно удержать. Вот огромная проблема! Почему бы не создать такие условия, чтобы люди спокойно работали в своей стране, не думая о том, что у них нет крыши над головой или нет денег, чтобы обеспечить семью...

Если кто-то думает, что у меня очень много денег, то я могу этих людей разочаровать. И сказать, что за свою жизнь я не так много заработал. Мне хватило их лишь для того, чтобы построить себе квартиру за свои деньги. Бесплатно же мне никто ничего не давал, в жизни я всего добивался только своим трудом. Гимнастика – не футбол, не хоккей, здесь больших денег нет. И, чтобы достигать больших результатов в гимнастике, ее нужно очень сильно любить и отдаваться ей целиком. Но очень хотелось бы, чтобы за эту работу люди получали взамен какую-то материальную поддержку. Чтобы они чувствовали, что это действительно ценится на высоком уровне. А пока у нас какое-то совершенно другое отношение по непонятным мне причинам. Получается, что чем больше ты делаешь, тем хуже к тебе отношение...



Я очень хотел открыть свою гимнастическую школу в Минске, но мне сказали: "Давай деньги". Я говорю: "Откуда я деньги возьму?" У меня нет денег, есть только голая идея...

Очень хотелось бы приносить пользу родине. И очень хотелось бы, чтобы моя работа оценивалась. Думаю, что я заслужил немного уважения, отдав на благо родного спорта и страны практически все свое здоровье, которое уже не вернешь. Врачи говорят, что это пожизненно...»

И вот на днях – хорошая новость. Председатель Белорусской федерации гимнастики **Елена Скрипель** заявила, что Иван Иванков может возглавить сборную Беларуси.

– Это уже не секрет, – приводит слова Елены Скрипель sportpanorama.by. – Недавно Иван прилетал в Беларусь, однако мы не смогли провести обстоятельный разговор. У него возник интерес к нашим предложениям, но надо решить текущие дела, например, расторгнуть действующий контракт в университете, где он работает преподавателем, разрешить проблему со здоровьем одного из детей. Надеюсь на то, что к середине июля он выйдет на связь и мы продолжим диалог.

– Устраивают ли его условия в США и сможете ли вы предложить ему более выгодные?

– Иванков говорил о том, что собирается вернуться в Беларусь в 2016 году. Мы предлагали ему досрочно расторгнуть контракт в США и помочь компенсировать все сопутствующие расходы. Кроме того, пожелания Ивана по поводу будущей работы в Беларуси мы готовы выполнить.

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Фото из архива автора.

КРЫЖАВАНКА



Газета для чалавека, як акно для хаты

Па гарызанталі: 1."... святла" – так называюць у пісьмах у рэдакцыю шматлікія чытачы сваю газету "Народная Воля", першы нумар якой выйшаў 11 ліпеня 1995 года. 5.Вялікі майстар сваёй справы (перан.). 7."Любіце, шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас лiтасцівы ... на свет пусціў" – словы Ф.Скарыны. 8.Карціна на палатне, якая пастаянна займае які-небудзь участак на сцяне. 9.Літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны часопіс, які выдаецца з красавіка 1953 года і які ў свой час узначальвалі П.Панчанка, Г.Бураўкін, В.Зуёнак, Г.Далідовіч і іншыя. 10.Штотыднёвая газета, на старонках якой друкавалі свае першыя творы В.Быкаў, Ул.Караткевіч, Я.Янішчыц, І.Мележ, І.Шамякін (абрэв.). 12."Наша ..." – газета, заснаваная ў 1906 г. у Вільні (г.Вільнюс). 14.Замкнёная выпуклая крывая. 16.Празаічны нарыс невялікага аб'ёму. 17.Салодкі ..., ды не дзве лыжкі ў рот (прык.). 20.Тое, што і збан. 21.Катэгорыя, разрад, клас. 25.У беларускай міфалогіі лёс чалавека, яго доля. 26. ... Дубоўка – імя беларускага паэта, першага галоўнага рэдактара літаратурна-мастацкага часопіса для дзяцей і падлеткаў "Бярозка", які да 1929 года насіў назву "Беларускі піянер". 28.Дарога, абсаджаная дрэвамі, кустамі. 29."Новы ..." – штотыднёвая газета, заснаваная ў 2002 годзе Мінскай гарадской арганізацыяй ТБМ імя Ф.Скарыны. 30.Хто ведае ... ды букі, таму і газеты ў рукі (прык.). 31.Розум – найлепшае ... (прык.).

Па вертыкалі: 2.Газета для чалавека, як ... для хаты (прык.). 3.Парадкавы лік друкаванага выдання. 4.Музычная п'еса. 6.Без газеты, як без ..., і ўдзень цёмныя аконцы (прык.). 8."Кніга – нібы папялушка,//Што вядзе нас на ..." – з верша М.Курылы "Кніга". 11."Буревестник", "..." – назвы газеты "Звязда" з пачатку яе існавання, калі яна выйшла на рускай мове; сучасную назву газета набыла 1 лістапада 1917 года і вось ужо амаль 100 год не здраджвае беларускаму слову. 13.Звярстаны набор, а таксама яго адбітак. 15.Багата ілюстраваны цікавы дзіцячы часопіс, які з 1978 года ўзначальвае пісьменнік Уладзімір Ліпскі. 18.Часопіс, які ўпершыню выйшаў 4 ліпеня 1941 года ў выглядзе сатырычнага плаката пад назвай "Раздавім фашысцкую гадзіну". 19.Штотыднёвая газета, якая выходзіла ў Гродне з 1992 па 2001 год. 22. "Роднае ..." – часопіс, які пачаў выдавацца з 1988 года з першапачатковай назвай "Беларуская мова і літаратура ў школе". 23.Адвар з ягад, траў. 24.У грэчаскай міфалогіі бажаство ў выглядзе жанчыны, якое ўвасабляе сілы прыроды. 27. ...-інтэрв'ю – кароткае інтэрв'ю.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.

г.Дзяржынск.

Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1.Прамень. 5.Ас. 7.Бог. 8.Пано. 9."Маладосць". 10."ЛіМ". 12.Ніва. 14.Авал. 16.Эсэ. 17.Мёд. 20.Жбан. 21.Ранг. 25.Кон. 26.Уладзімір. 28.Алея. 29.Час. 30.Аз. 31.Багацце.

Па вертыкалі: 2.Акно. 3.Нумар. 4.Ронда. 6.Сонца. 8.Парнас. 11."Молот". 13.Вёрстка. 15."Вясёлка". 18."Вожык". 19."Пагоня". 22.Слова. 23.Узвар. 24.Німфа. 27.Бліц.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул. Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл. рэкламнага аддзела: (017) 3286609
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

9 772071 964000 15046

Падпісныя індэксы: 63222 – для індывідуальных падпісчыкаў, 632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 15.06.2015 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 25420 экз. Заказ №2229.